УДК 94(476)

# АГЛЯД АРХІЎНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ ПА ПЫТАННЯХ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫХ ТРАНСФАРМАЦЫЙ ГАРАДСКОГА ЖЫЦЦЯ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБШЧЫНЫ Ў 1944–1991 гг.

*Пятрэнка Наталля Аляксандраўна*
аспірант кафедры гісторыі Беларусі
Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава
(г. Віцебск, Беларусь)

*Даследаванне сацыякультурнай прасторы беларускіх гарадоў пасляваеннага перыяду з'яўляецца важным напрамкам сучаснай гістарычнай навукі. У артыкуле пастаўлена мэта выявіць комплекс архіўных матэрыялаў па пытаннях пасляваеннага горадабудаўніцтва Віцебшчыны і вызначыць іх асаблівасці.*

Крыніцазнаўчую базу даследавання складаюць любыя аб'екты, якія змяшчаюць інфармацыю па пытаннях сацыякультурных трансфармацый гарадскога жыцця на тэрыторыі Віцебшчыны ў 1944 – 1991 гг. і ўключаны ў працэс гістарычнага даследавання. Аснову вывучэння сацыякультурнай прасторы гарадоў пасляваеннага часу займаюць крыніцы, якія прадстаўлены архіўнымі матэрыяламі, што знаходзяцца ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў (БДАКФФД), Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі (БДАНТД), Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці (ДАВВ), занальных архіваў Віцебскай вобласці (Глыбокае, Орша, Полацк), а таксама калекцый Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

Значную ролю ў даследаванні займае комплекс архіўных пісьмовых крыніц, сярод якіх вылучаюцца наступныя групы: заканадаўчыя акты, справаводныя матэрыялы, статыстычныя крыніцы, перыядычны друк, а таксама дакументацыя асабістага паходжання. Заканадаўчыя акты, якія можна падзяліць на дакументацыю вышэйшых і рэгіянальных органаў дзяржаўнай улады, а таксама дакументацыю КПБ, змяшчаюць інфармацыю па пытаннях заканадаўчых эвалюцый пасляваеннага часу. У фондзе 968 НАРБ Вярхоўнага Савета БССР захоўваюцца законы і пастановы Вярхоўнага Савета, пратаколы і стэнаграмы сесій, камісій, нарад дэпутатаў, эканамічнага савета БССР і інш. [1, с. 27]. Знаёмства з аб'яднаным архіўным фондам 1966 ДАВВ Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта дазволіць прасачыць асаблівасці заканадаўчай дзейнасці Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта праз пастановы, распараджэнні, загады, інструкцыі рэгіянальных органаў кіравання і Віцебскага абкама КПБ [2, с. 41]. Праца з заканадаўчымі дакументамі дазволіць прасачыць эвалюцыю палітыкі дзяржаўных органаў кіравання ў розных сферах развіцця як гарадоў БССР, так і Віцебшчыны ў прыватнасці.

Дакументы справаводства выдаваліся рознымі дзяржаўнымі, судовымі, эканамічнымі, палітычнымі і грамадскімі арганізацыямі (установамі) і ўяўлялі комплексы арганізацыйна-распарадчай, планавай, улікова-кантрольнай і справаздачнай дакументацыі [3, с. 75]. Важныя звесткі ўтрымліваюцца ў матэрыялах справаздач, прадстаўленых у асноўным статутамі і штогадовымі справаздачамі. Напрыклад, аб'яднаны архіўны фонд 1737 ДАВВ дазваляе прасачыць дзейнасць гарадскога і раённых аддзелаў адукацыі Віцебскай вобласці [2, с. 376]. Справаводная дакументацыя дазволіць прасачыць рэальныя вынікі дзейнасці розных прадпрыемстваў, медыцынскіх, адукацыйных і культурна-грамадскіх устаноў і арганізацый Віцебшчыны.

Статыстычныя крыніцы выкарыстоўваюцца для параўнальнага аналізу трансфармацый сацыякультурнага гарадскога жыцця на розных этапах развіцця грамадства. Знаёмства з дзейнасцю Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР, які знаходзіцца ў фондзе 30 НАРБ, дае важную ўліковую інфармацыю агульнадзяржаўнага і рэгіянальнага характару [4, с. 31]. Пытанні эвалюцыі сацыяльнага жыцця Віцебшчыны змяшчаюцца ў фондах 1974 і 2895 ДАВВ, дзе ўтрымліваюцца звесткі аб натуральным і механічным руху насельніцтва Віцебшчыны, стане прамысловасці, капітальнага будаўніцтва, адукацыі, медыцынскага і бытавога абслугоўвання насельніцтва, наяўнасці жыллёвага фонду, выніках правядзення ўсесаюзных перапісаў насельніцтва па г. Віцебску (1959, 1970, 1979, 1989) [2, с. 97]. Асабліва важныя дадзеныя вылучаны па пытаннях дэмаграфічнага складу насельніцтва, што дае магчымасць прасачыць асноўныя паказчыкі сацыяльнага жыцця Віцебшчыны.

Матэрыялы перыядычнага друку змяшчаюць інфармацыю па гісторыі штодзённага жыцця гарадоў, аналітычныя дадзеныя падзей і мастацка-публіцыстычныя матэрыялы аўтараў. Перыядычны друк мае вялізную колькасць матэрыялаў, якія апавядаюць пра падзеі развіцця эканамічнага, сацыяльнага і культурнага гарадскога жыцця Віцебшчыны. Напрыклад, у фондзе 3486 ДАВВ газеты «Віцебскі рабочы» знаходзяцца: звароты грамадзян у рэдакцыю газеты; перапіска аб аналізе працы ўстановы, публікацыях; анкеты-апытанні рабочых, артыкулы пазаштатных аўтараў; фатаграфіі, копіі фатаграфій грамадска-палітычных і культурных падзей, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў Віцебшчыны [2, с. 97]. Матэрыялы перыядычнага друку вылучаюцца сярод іншых пісьмовых крыніц, бо дадзеныя матэрыялы могуць выкарыстоўвацца ў якасці своеасаблівага летапісу па гісторыі гарадоў рэгіёна.

Мемуары, дзённікі і перапіска – гэта дакументацыя асабістага паходжання, што дазваляе прасачыць гарадскую штодзённасць праз аповед сведкаў і ўдзельнікаў падзей. Напрыклад, у асабістым фондзе 406 ДАВВ А. М. Падліпскага зберагаюцца рукапісы, артыкулы, нарысы, нататкі па пытаннях гарадскога будаўніцтва, гісторыі і краязнаўстве Віцебшчыны [2, с. 94]. Дадзеныя матэрыялы, з аднаго боку, дапаўняюць недахопы іншых пісьмовых крыніц з іх палітызаванасцю, а з другога – даюць ўяўленне пра перыяд ад адной асобы, што мае адбітак суб'ектыўнасці інфармацыі. Але выкарыстанне дакументацыі асабістага паходжання дазваляе дапоўніць і пашырыць інфарматыўнасць, што дае падставу ўключыць яе ў даследаванне разам з крыніцамі вуснай гісторыі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Выкарыстанне візуальных крыніц па гісторыі гарадской штодзённасці дапамагае рэканструяваць гістарычныя падзеі. Адметная роля па пытаннях горадабудаўніцтва належыць картаграфічным і планава-праектным матэрыялам розных перыядаў. У фондзе 5 БДАНТД змяшчаецца праектная дакументацыя Інстытута па комплексным праектаванні аб'ектаў жыллёва-грамадзянскага прызначэння Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Савета народных дэпутатаў: праекты планіроўкі абласных і раённых цэнтраў Віцебскай вобласці (гарадоў Багушэўск, Браслаў, Гарадок, Верхнядзвінск, Віцебск, Лепель, Наваполацк, Орша, Полацк, Сянно); планы будаўніцтва, аднаўлення і рэканструкцыі разбураных вайной аб'ектаў народнай гаспадаркі г. Віцебска і Віцебскай вобласці ў галіне прамысловасці, жыллёвай і камунальнай гаспадаркі, народнай адукацыі, аховы здароўя і культуры [5, с. 34]. Дадзеныя матэрыялы дазваляюць прасачыць: аднаўленне пасля вайны, рэканструкцыю цэнтра, інтэнсіўны рост прамысловых і жылых раёнаў, развіццё інфраструктуры і культурна-бытавога абслугоўвання.

У фондах БДАКФФД захоўваюцца матэрыялы, якія прадстаўлены фотаздымкамі, відэафільмамі і аўдыязапісамі розных часоў. Фотадакументы пасляваеннага часу распавядаюць пра аднаўленне разбураных ў гады вайны гарадоў; стан і развіццё прамысловай вытворчасці, будаўнічай галіны; культурныя працэсы ў грамадстве, звычаі і абрады гарадскіх жыхароў [1, с. 43]. У калекцыі фотадакументаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея захоўваюцца фотаздымкі, на якіх адлюстраваны падзеі сацыяльнага, эканамічнага і культурнага жыцця Віцебшчыны. Асаблівую актуальнасць у наш час набывае выкарыстанне відэа- і аўдыяматэрыялаў – відэафільмы, інтэрв'ю, запісы на дыктафон і інш. На стужках, якія зберагаюцца ў фондах БДАКФФД, можна ўбачыць, як змяняўся горад і выглядала гарадская штодзённасць. Цікавымі для даследавання з'яўляюцца кадры фільмаў «Віцебскія ўзоры» (1973 г.), «Горад майго лёсу» (1974 г.), «Святкаванне 1000-годдзя г. Віцебска» (1974 г.) [6, с. 23]. У кінадакументах па гісторыі Віцебска, як і ў фотадакументах, падзея фіксуецца ў момант здзяйснення, што дае магчымасць аднавіць мясцовы каларыт, убачыць панарамы гарадоў, адчуць атмасферу вялікай гістарычнай падзеі і глыбей зразумець вобраз эпохі.

У айчыннай гістарычнай навуцы ўзрасла цікавасць да ўсебаковага даследавання гарадскога жыцця. У дадзеным артыкуле была вылучана крыніцазнаўчая база даследавання пасляваеннага развіцця гарадоў Віцебшчыны, якая складаецца з выкарыстання архіўных пісьмовых крыніц, у комплексным вывучэнні з візуальнымі і фонавымі матэрыяламі. Такім чынам, крыніцазнаўчы агляд дазваляе прасачыць накірунак дзейнасці даследчыкаў, вылучыць асноўныя этапы вывучэння азначанай тэмы.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Архивные документы Республики Беларусь – сокровищница социальной памяти государства: справочник / сост. Т. И. Седляревич. – Минск : НАРБ, 2005. – 144 с.
2. Государственный архив Витебской области : путеводитель, 1917–2006 / сост. Т. В. Буевич, Ю. С. Петухов. – Минск : Медисонт, 2011. – 936 с.
3. Ходзін, С. М. Крыніцы гісторыі Беларусі (гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне): вучэб. дапам. / С. М. Ходзін. – Мінск : БДУ, 1999. – 193 с.
4. Государственные архивы Республики Беларусь (1944–1997). Краткий справочник / сост. А.Н. Михальченко, С. В. Жумарь, Л. Н. Александрова и др. – Минск.: БелНИИДАД, 2000. – 476 с.
5. Белорусский государственный архив научно-технической документации. Путеводитель. Поступления 1970–1993 гг. Государственный комитет по архивам и делопроизводству Республики Беларусь. – Минск.: БелНИИДАД, 1998. – 72 с.
6. Белорусский государственный архив кинофотофонодокументов: Справочник. Ч. 1: Кинодокументы / сост. С. В. Жумарь. – Молодечно: Тип. «Победа», 2002. – 718 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова